«Зацвярджаю»
Прарэктар па выхаваўчай
і сацыяльнай працы
_________ Т.В. Сакалова
«___» ____10____ 2016 г.

«Зацвярджаю»
Дэкан філалагічнага
факультэта
_______В.А. Фелькіна
«_07_» __10__ 2016 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ АДКРЫТЫМ ФОТАКОНКУРСЕ “ПЕРШАЦВЕТ”

Фотаконкурс “Першацвет” праводзіцца згодна з планам працы БрДУ імя А.С. Пушкіна ў межах рэалізацыі падпраграмы «Сям’я і дзяцінства» дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016–2020 гады, а таксама ў межах мерапрыемстваў да Дня маці (па асобным плане). Фотаконкурс з’яўляецца **адкрытым**, у ім могуць прыняць удзел студэнты розных факультэтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, вучні агульнаадукацыйных устаноў Брэсцкай вобласці.

**Мэты і задачы** фотаконкурсу – актуалізаваць цікавасць моладзі (вучняў і студэнтаў) да фотажурналістыкі як вобласці творчай дзейнасці.

**Арганізатарамі** адкрытага фотаконкурсу “Першацвет” з’яўляюцца кафедра журналістыкі філалагічнага факультэта, аддзел выхаваўчай працы з моладдзю.

**Аргкамітэт** фотаконкурсу:

1. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Клундук С.С. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Смаль В.М. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
4. Кошык Т.М. – начальнік аддзела выхаваўчай працы з моладдзю;
5. Граноўская К.А. – загадчык студэнцкага клуба.

**Умовы правядзення фотаконкурсу:**

Фотаконкурс праводзіцца ў 2 этапы:

1. першы этап – “Ты подарила мне жизнь” (да Дня маці):
   - да 30.10.2016 – атрыманне аргкамітэтам фотаматэрыялаў;
   - з 30.10.2016 – 20.11.2016 года – праца фотавыставы дасланых матэрыялаў;
   - 18.11.2016 г. – узнагароджванне пераможцаў;
2. другі этап «Люди, которые нас удивили»:
   - да 01.05.2017 – атрыманне аргкамітэтам фотаматэрыялаў;
   - з 03.05.2017 – 14.05.2017 – праца фотавыставы дасланых матэрыялаў;
   - 12.05.2017 г. – узнагароджванне пераможцаў.

Для ўдзелу ў першым этапе фотаконкурсу **да 30 кастрычніка 2016 года** неабходна даслаць:

1. **заяўку** на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку; навучальная ўстанова, факультэт, група, клас; кантактны тэлефон) (форма заяўкі прыкладваецца);
2. **фотаздымак/фотаздымкі** ў электронным варыянце на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by);
3. **фотаздымак/фотаздымкі** ў раздрукаваным варыянце фармату А4 на адрас: 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28; каб. 307 навучальнага корпуса № 2).

Для ўдзелу ў другім этапе фотаконкурсу **да 01 мая 2017 года** неабходна даслаць:

1. **заяўку** на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку; навучальная ўстанова, факультэт, група, клас; кантактны тэлефон) (форма заяўкі прыкладваецца);
2. **фотаздымак/фотаздымкі** ў электронным варыянце на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by);
3. **фотаздымак/фотаздымкі** ў раздрукаваным варыянце фармату А4 на адрас: 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28; каб. 307 навучальнага корпуса № 2).

**Падвядзенне вынікаў фотаконкурсу**

Фотавыстава дасланых прац першага этапу будзе працаваць з 30.10.2016 года па 20.11.2016 года ў аўдыторыі 322 філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна (вул. Міцкевіча, 28, навучальны корпус № 2, 3 паверх).

Фотавыстава дасланых прац другога этапу будзе працаваць з 03.05.2017 года па 14.05.2017 года ў аўдыторыі 322 філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна (вул. Міцкевіча, 28, навучальны корпус № 2, 3 паверх).

Ацэньвае працы ўдзельнікаў і падводзіць агульныя вынікі **журы.** Пераможцы першага этапу фотаконкурсу (па запрашэнні аргкамітэта) узнагароджваюцца дыпломамі БрДУ і сувенірамі падчас правядзення рэгіянальнага вучэбна-метадычнага семінара “Прафесія – журналіст” (**18.11.2016 г.**).

Пераможцы другога этапу фотаконкурсу (па запрашэнні аргкамітэта) узнагароджваюцца дыпломамі БрДУ і сувенірамі падчас правядзення сустрэчы з ветэранамі вайны і працы Ленінскага раёна г. Брэста (“Уроки Мужества и Вдохновения”, **12.05.2017 г**.).

**Кантактныя тэлефоны:**
+ 8 (016) 21 63 50 – кафедра журналістыкі;
+ 375 29 724 30 85 – Клундук Святлана Сяргееўна – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.